# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ



***БЛАНК ЗАДАННЯЎ***

**11 клас**

**Варыянт 1**

*Магілёў, 2022 год*

Шаноўныя адзінаццацікласнікі!

У нашай краіне 2022 год аб’яўлены Годам гістарычнай памяці. Гэта тое, без чаго немагчыма ўявіць сабе будучыню. Ведаць родную гісторыю, мову і літаратуру, берагчы іх – значыць быць сапраўдным патрыётам. Шануйце нашу спадчыну!

**Заданне 1.** Наш класік Янка Купала вядомы, акрамя іншага, сваёй схільнасцю і здольнасцю да словатворчасці. Вельмі прыкметна гэта выявілася на прыкладзе складаных слоў.

Прачытайце фрагменты яго твораў і вызначце, якім чынам былі ўтвораны вылучаныя складаныя словы. У адпаведнасці з гэтым упішыце ў ячэйкі табліцы (з улікам патрэбнай іх колькасці) паасобна ўсе **кампаненты** адпаведнага складанага слова **(акрамя канчатка)**, якія былі **задзейнічаны ў словаўтварэнні.**

Вызначце таксама, у якасці чаго ўзяты для ўтварэння складанага слова кожны з кампанентаў (як аснова слова, цэлае слова, суфікс і г. д.) і адзначце гэты яго статус у адпаведнай ячэйцы.

Утваральную аснову трэба паказваць як вылучаную частку ў складзе слова, напрыклад: *малад-(ы)*. Калі ад асновы адсякаецца пэўны яе фрагмент, гэта трэба паказваць так: *піл/ава-(ць)*.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

***Фрагменты Купалавых твораў:***

1. Ты, зялёная дубрава,
Сон скідай, расцвітай,
І шумеці добрай славай
Не кідай на ўвесь край.
…
Казку быўшых ***песняспеваў***
Распалі, разагрэй;
Размяці управа, ўлева
Сухацвет, сухавей.

2. Малюся я небу, зямлі і прастору,
Магутнаму Богу – ***Ўсясвету*** малюся,
Ва ўсякай прыгодзе, ва ўсякую пору
За родны народ Беларусі.

3. У цябе, саколіка,
Ані свайго полейка,
Ані свайго воліка,
Ані свайго століка.
…
І клянеш напэўнае
Гора неразвейнае,
Долю ***пустасейную***,
Долю беззямельную.

4. Я не сокал ***зоркавокі,***
Не арол адважны,
Што так думна за аблокі
Ўзносіцца з іх кажны.

5. У гэткай хвілі цяжкай, труднай
Нямілым робіцца жыццё,
Пракляў бы цэлы свет ***злалюдны***
І сэрца роднага біццё.

6. Бой апошні – памерці, ці жыць,
На ***ўсясветным*** абшары гарыць.

На штыхах перакулены трон,
Руйнавальны трасе небам звон…

**Заданне 2.** У фрагментах 1–3 Купалавых твораў, змешчаных у заданні 1, знайдзіце словы, у складзе якіх маюцца мінімум два мяккія зычныя гукі. Упішыце гэтыя словы ў табліцу, размеркаваўшы іх у адпаведнасці з колькасцю мяккіх зычных.

**Заўвага.** Словы запісвайце ў той форме, у якой яны ўжыты ў творы (тоесныя формы паўторна не запісвайце).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Заданне 3.** З прыведзенага тэксту выпішыце назвы някроўных сваякоў і дайце азначэнне гэтых назваў.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Сваяцкія ўзаемадачыненні ў беларусаў рэгуляваліся пераважна нормамі звычаёвага права. Напрыклад, звычайна малодшы брат заставаўся даглядаць бацькоў і яму пераходзіла пасля выдзелаў гаспадарка бацькі. Уяўлялі таксама, што знахарскія, чараўніцкія здольнасці могуць перадавацца толькі старэйшаму ці малодшаму сыну ці дачцэ, бо ў іх “мацнейшая кроў”.

У сваяцкай сістэме беларусаў былі распаўсюджаны, такія назвы сваяцтва: бацька, маці, сын, дачка, муж, жонка, кумы і хроснікі, брат, сястра, дзед, баба, унукі, айчым і мачаха, дзядзька, цётка, пляменнік, пляменніца, пасынак і падчарыца, дваюрадны брат, траюрадны брат, прадзед, праўнук *(Паводле Д. Канаплянікава).*

**Заданне 4.** Пасля аднаўлення сапсаванага вірусам тэксту рэдактар паспрабаваў максімальна аднавіць тэкст, зрабіў лексічную, арфаграфічную і пунктуацыйную праўкі. Аднак, абмежаваны ў часе, зусім забыў на сінтаксічную праўку. Давайце дапаможам рэдактару знайсці і выправіць сінтаксічныя памылкі. Выпішыце памылку, запішыце правільны варыянт і тлумачэнне неабходнасці праўкі.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Галоўны клопат Усяслава – выраб зброі для дружыны. Як пераканаўся Усяслаў, кавалямі сапраўды тварыліся цуды з жалеза і сталі, карыстаючыся кузнечнымі горнамі з мяхамі для паддуву паветра, накавальнямі, молатамі і малаткамі, кляшчамі і зубіламі, бародкамі і напільнікамі. Выробленая зброя ў кузнях, сродкі абароны і ўся амуніцыя паступалі ў княжацкае войска, ***апрабоўваліся*** дружыннікамі.

Усяслаў высока цаніў стараннасць седляроў, якія не толькі выраблялі надзейныя сёдлы для баявых коней, але і збрую для дружыны князя.

Усяслаў сфарміраваў сталыя гарнізоны дзеля аховы гарадоў, кіраўнікамі якіх ***прызначыў*** правераных у бітвах дружыннікаў. Гарады старанна ўпарадкоўваліся, праводзіліся інжынерныя работы, – клаліся маставыя і рабіліся водаадводы.

Усяслаў ***правёў*** рэформу войска. Усю дружыну ён раздзяліў на тры асноўных аддзела: атрады стралкоў-лучнікаў, пяхоту і конніцу. Стралкі-лучнікі ахоўвалі і стрымлівалі першыя атакі ворага (*Паводле І. Саверчанкі*).

**Заданне 5.** Вызначце спражэнне падкрэсленых у папярэднім заданні дзеясловаў. Утварыце ад іх: 1) форму інфінітыва; 2) форму 2-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу (з абавязковай пастаноўкай націску); 3) дзеепрыслоўе.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

**Заданне 6.** У папярэднім тэксце (першы абзац) знайдзіце слова *абароны* і адкажыце, ці адпавядаюць яму наступныя прыметы (у графе “Правільна” табліцы насупраць правільных сцверджанняў пастаўце “плюс”).

**Заўвага.** Для выканання задання неабходна разглядаць слова *абароны* ў пачатковай форме.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Со всех сторон били орудия мелких калибров, средних, калибров покрупнее, наконец, крупных, очень крупных, самых крупных, а иногда и сверхмощные пушки, еле слышно ухавшие глубоко в тылу и вдруг с неожиданным воем, скрежетом низвергавшие свои колоссальные снаряды в какой-нибудь на вид невинный лесок. Иногда откуда-то, с неожиданной стороны, врывался осколок, с силой ударялся в землю, делал рикошет, кружился, трещал, звенел, ныл, как волчок, и с отвратительным стоном уносился прочь, сбивая по пути с деревьев ветки и шишки. *(По В. Катаеву)*.

**Заданне 8.** Прачытайце азначэнні тэрмінаў і паняццяў, якія так або інакш звязаны з літаратурай і літаратурным працэсам. Назавіце іх. Суаднясіце гэтыя тэрміны і паняцці з выявамі, якія б маглі стаць ілюстрацыямі. Запоўніце табліцу ў бланку адказаў.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | |
|---|---|
| **1** | Напрамак у літаратуры, адна з важных рыс якога – зварот да вобразаў і форм антычнага мастацтва; мае строгую іерархію жанраў: “высокія” і “нізкія”. Арыентуецца на прыгожае, узнёслае, гераічнае і тыпізуе яго, не падкрэслівае індывідуальнае, непаўторна-асаблівае. |
| **2** | Апісанне знешняга выгляду, адзення, рухаў, позы літаратурнага персанажа. |
| **3** | Драматычны твор, заснаваны на непрымірымым канфлікце паміж моцнай высакароднай асобай і абставінамі, якія не даюць ёй магчымасці рэалізавацца. Гэты кафлікт мае глыбокі філасофскі змест, актуальны характар у палітычных, сацыяльных або духоўных адносінах. |
| **4** | Умоўнае абазначэнне думкі, ідэі, перажывання, з’явы праз мастацкі вобраз, які нечым нагадвае іх. |
| **5** | Падрабязнасць у апісанні пэўных аб’ектаў у творы (пейзажу, партрэта, дзеяння, персанажа і г. д.), якая з асаблівай сілай абуджае ўяўленне і творчую думку чытача і нясе значную эмацыянальную і сэнсавую нагрузку. |
| **6** | Перасоўны лялечны тэатр, вядомы ў Беларусі з XVI стагоддзя. |

| | | |
|---|---|---|
|  А |  Б |  В |
|  Г |  Д |  Е |

**Заданне 9.** Ці добра ведаеце творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа? Вызначце, якія з прыведзеных ніжэй фактаў адносяцца да жыцця і творчасці гэтых песняроў, а таксама праўдзівасць гэтых фактаў. Запоўніце адпаведныя слупкі табліцы ў бланку адказаў.

***Узор:***

*Факты:*

*...*

*7. Дзеянне аповесці “Непаўторная вясна” адбываецца ў 1941–1945 гг.*

*8. Нарадзіўся ў 1921 годзе ў вёсцы Глінішча.*

*9. Заснаваў літаратурнае аб’яднанне “Маладняк”*

*...*

| *Іван Шамякін* | | *Іван Мележ* | | *Не адносіцца да жыцця і творчасці ні І. Шамякіна, ні І. Мележа* |
|---|---|---|---|---|
| *праўдзівы* | *памылковы* | *праўдзівы* | *памылковы* | |
| | *7* | *8* | | *9* |

*Каментарый: запоўненая такім чынам табліца сведчыць пра наступнае:*

*І. Шамякін з’яўляецца аўтарам аповесці “Непаўторная вясна”, але факт утрымлівае памылку (дзеянне адбываецца ў 1939–1940 гг.);*

*І. Мележ сапраўды нарадзіўся ў 1921 годзе ў вёсцы Глінішча;*

*ні І. Шамякін, ні І. Мележ не мелі дачынення да заснавання “Маладняка”.*

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

***Факты:***

1. Першая частка трылогіі “На ростанях” называецца “У глыбі Палесся”.
2. Верш “А хто там ідзе?” перакладзены больш чым на сто моў свету.
3. У 1922 годзе быў напісаны верш “Залатая асенняя раніца”.
4. У 1921–1923 гадах была завершана праца над паэмай “Новая зямля”.
5. Зборнік “Матчын дар” мае падзагаловак “Думы і песні”.
6. П’еса “Раскіданае гняздо” была надрукавана ў 1913 годзе, адразу пасля напісання.
7. У 1908 годзе выйшаў зборнік “Жалейка”, а ў 1910 – “Гусляр”.

**Заданне 10.** Уважліва разгледзьце змест зборніка «“Настане дзень баёў апошніх…”: ваенная тэма ў беларускай паэзіі».

А. Патлумачце, чаму гэтая назва не спадабалася рэдактару выдавецтва.

Б. Прапануйце дзве назвы гэтага зборніка, зыходзячы з розных прынцыпаў яго ўкладання. У вас атрымаюцца два новыя зборнікі з аднолькавым зместам. Запішыце, чаму вы назвалі зборнікі так.

В. Дапоўніце змест кожнага новага зборніка двума іншымі творамі, якія б адпавядалі прапанаваным вамі прынцыпам.

Г. Выберыце адну з прадстаўленых карцін на вокладку першапачатковага зборніка. Абгрунтуйце свой выбар.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

ЗМЕСТ

1. Аркадзь Куляшоў
“Маці”

2. Еўдакія Лось
“Дзяўчаты мінулай вайны”

3. Пятрусь Броўка
“Спатканне”

4. Янка Брыль
“Memento mori”

5. Аляксей Пысін
“Проня”

6. Аркадзь Куляшоў
“Над брацкай магілай”

7. Максім Танк
“Мы вернемся”

8. Міхась Лынькоў
“Васількі”



*Дэніс Дайтан “Бітва пры Ватэрлоа”*



*Віктар Васняцоў “Віцязь на раздарожжы”*



*Міхал Савіцкі “Апазнанне”*